Источник: "Звязда" - 2012-06-20

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ КАЛЕКТЫЎ ЦЭНТРАЛЬНАГА БАТАНІЧНАГА САДУ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Цэнтральнага батанічнага саду Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з 80-годдзем утварэння гэтай установы.**

«Гэты ўнікальны сад, які мае бясцэнную калекцыю ўзораў айчыннай і сусветнай флоры, з'яўляецца нацыянальным здабыткам», — гаворыцца ў віншаванні.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, ва ўстанове праводзіцца шырокі спектр навуковых даследаванняў. Яго супрацоўнікі таксама вядуць вялікую асветную і выхаваўчую работу, дапамагаючы дарослым і юным наведвальнікам глыбей пазнаць прыроду роднай Беларусі і разнастайнасць расліннага свету планеты.

Калектыву Цэнтральнага батанічнага саду кіраўнік дзяржавы пажадаў моцнага здароўя, новых дасягненняў, шчасця і дабрабыту.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў
Цэнтральнага батанічнага сада